**Багарадава Таццяна Робертаўна**
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
e-mail: t.baharadava@psu.by

# СПЕЦЫФІКА АДЛЮСТРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ Ў ВАЕННАЙ АПОВЕСЦІ 1980-х гг. У. ДАМАШЭВІЧА І У. ЛІПСКАГА

***Анатацыя:*** у артыкуле разглядаюцца мастацкі асаблівасці паказу нацыянальнай ідэнтычнасці на прыкладзе ваеннай аповесці перыяду 1980-х гг. беларускіх аўтараў У. Дамашэвіча і У. Ліпскага. Жанр аповесці ў мастацкай спадчыне У. Дамашэвіча характарызуецца псіхалагічным раскрыццём персанажаў. Асновай творчасці пісьменнікаў стаў дакументалізм, які ў У. Ліпскага з’явіўся пазнакай жанрава-стылёвых канонаў літаратуры сацыялістычнага рэалізму, што выявілася праз яскравую героіку персанажаў, прататыпамі якіх былі рэальныя асобы.

***Ключавыя словы:*** нацыянальная ідэнтычнасць, дакументалізм, шматстайнае адлюстраванне, псіхалагізм, рэтраспекцыя.

**Tatyana Bogoradova**
Polotsk State University
e-mail: t.baharadava@psu.by

# SPECIFICS OF THE REFLECTION OF NATIONAL IDENTITY IN THE WAR NOVEL OF THE 1980s BY V. DOMASHEVICH AND V. LIPSKIY

***Abstract:*** the article deals with the artistic peculiarities of showing national identity on the example of a war novel of the 1980s by Belarusian authors V. Domashevich and V. Lipsky. The novel genre in the artistic heritage of V. Domashevich is characterized by psychological disclosure of characters. Domashevich’s fiction is characterised by psychological disclosure of characters. The basis of the writers’ creativity was documentalism, which for V. Lipsky was a mark of the genre-stylish canons of socialist realism literature, manifested through the vivid heroics of characters whose prototypes were real personalities.

***Keywords:*** national identity, documentalism, diverse reflection, psychologism, retrospection.

Зварот да праблем вызначэння нацыянальнай ідэнтычнасці ў мастацкай спадчыне Уладзіміра Дамашэвіча (1928–2014) і Уладзіміра Ліпскага (нар. у 1940 г.) характарызуецца некаторай спецыфікай: малая радзіма У. Дамашэвіча ўваходзіла ў склад Заходняй Беларусі, а У. Ліпскага – Беларусі Савецкай. У перыяд 1980-х гг. у ваеннай аповесці аўтараў нацыянальным пытанням надавалася належная ўвага,

што знайшло адлюстраванне ў вывучэнні дакументаў і выкарыстанні вопыту прафесійнай працы пісьменнікаў у галіне журналістыкі.

Эстэтыка У. Дамашэвіча трансфармавана часамі «адлігі» 1960-х гг. і выяўляецца ў крытычным стаўленні да рэчаіснасці. Светапоглядныя арыенціры аўтара фарміраваліся падчас працы ў выдавецтве «Народная асвета» ў працэсе рэдагавання твораў беларускіх класікаў. Пазіцыю пісьменніка трапна характарызаваў М. Тычына: «Не стараецца абавязкова спадабацца, не клапоціцца, што яго не заўважаць, і турбуецца толькі аб адным, каб сказаць тое, што яго хвалюе» [9, с. 114].

У перыяд 1970-х гг. У. Дамашэвіч прыходзіць да дакументальнага паказу вайны падчас стварэння аповесці-хронікі «Порахам пахла зямля» (1975). Пад уражаннем выхаду ў свет кнігі «Я з вогненнай вёскі...» (першае выданне – 1974) А. Адамовіча, Я. Брыля і У. Калесніка, пазначанай кантэксам адлюстравання трагедыі спаленых беларускіх вёсак, У. Дамашэвіч прысвячае аповесць «Кожны чацверты» (1983) Арыядне Казей – сястры міфалагізаванага савецкай літаратурай героя Вялікай Айчыннай вайны Марата Казея.

У першай палове 1980-х гг. творчая свабода пісьменнікаў яшчэ была абмежавана цэнзурнымі рамкамі, аднак У. Дамашэвіч здолеў абраць трагедыйныя ракурсы адлюстравання партызанскай вайны, акрэсленай А. Адамовічам як «вайна пад стрэхамі», і на нацыянальнай глебе стварыць малюнак усенароднай барацьбы з ворагам. Г. Далідовіч заўважыў, што «і пры абрэзцы ўсё ж засталося Дамашэвічава дрэва з яркімі вобразамі» [5, с. 248]. Прыём «шматстайнага адлюстравання» аб’ектыўна паказваў партызанскую барацьбу ў розных ракурсах: ідэйная абарона Айчыны і ўлады (Гракові), служэнне народу (Юля і Леанід Казакі), псіхалагічны супраціў ворагу (Мурашка), беспадстаўнае знішчэнне людзей (Ярэміч). С. Андраюк адзначаў, што «ў пераважнай большасці твораў У. Дамашэвіча можна заўважыць дзве выразна акрэсленыя асаблівасці ягоных мастакоўскіх адносін да рэчаіснасці: моцны давер да жыццёвай першаасновы і катэгарычнасць маральных ацэнак» [1, с. 24].

Палемічны ваенны кантэкст ствараецца на прыкладзе антаганістычных вобразаў партызанскіх камандзіраў Дзятко і Дарашэнкі. В. Локун адзначала, што гуманізм Дзядко «абстрактны, бо скіраваны на абарону ідэі, а не чалавека» [2, с. 355]. Для яго важна выкананне дырэктыў па законах ваеннага часу. У творы вобраз змагара з фашызмам набывае своеасаблівы нацыянальны кантэкст: Ох, ужо гэтая беларуская сціпласць <…>. Хлопец павінен быць байцом, а не мокрай курыцай. І калі ён смелы ў баі, то павінен быць смелы і перад начальствам [6, с. 24-25]. У перыяд 1980-х гг. творчасць У. Дамашэвіча пазначана рысамі псіхалагізму, што з’явілася вынікам аўтарскага імкнення да адлюстравання ўнутранага стану персанажаў. Пераканаўча паказаны душэўныя пакуты партызан-падрыўнікоў у выніку беспадстаўнага самасуду над Вальковічам: Злосць – заўсёды кепскі дарадчык. Калі

яна гаворыць – а яна часцей за ўсё крычыць, – то ў чалавека сляпыя вочы і затуманеныя мазгі [6, с. 63].

Статыстыка савецкіх часоў канстатавала страту кожнага чацвёртага (у некаторых раёнах – кожнага другога) жыхара Беларусі: у названай аповесці нямецкі камендант з шэрагу палонных сімвалічна выбірае для расстрэлу кожную чацвёртую ахвяру. Тым самым пісьменнік даводзіць гуманістычную думку пра абсурднавялікую колькасць чалавечых страт у Беларусі на працягу мінулай вайны: Калі гаварыць груба, мы плацім за іх чыстай крывёю… Чыстай крывёю [6, с. 78].

Антыпод Ваўчэцкага – яго выпадковы паплечнік па злачынстве Паланейчык – персаніфікавана адлюстроўвае ваенную рэальнасць праз ракурс апісання беларускай прыроды: Праходзяць гады – і новыя дрэвы вырастаюць і буяюць на тым месцы, дзе нядаўна ляжала спарахнелае і збуцвелае бервяно [6, с. 3]. У выніку пісьменнік дае адказ на палемічныя пытанні, што народжаны вайной на акупіраванай беларускай тэрыторыі, дзе партызану-вызваліцелю неабходна было выяўляць надзвычайныя якасці.

У сааўтарстве з У. Сазановічам створана аповесць «Першым заўсёды цяжка» (1986), якая вызначаецца стылёвым супрацьпастаўленнем з папярэднімі творамі мастака. В. Локун сцвярджае, што «аповесць У. Дамашэвіча можна аднесці да «эталонных» твораў літаратуры сацыялістычнага рэалізму» [2, с. 357]. Пісьменнік працаваў у жанры дакументальнай аповесці і напісаў пра дзейнасць Клецкага камсамольскага падполля ў перыяд вайны. Нацыянальны кантэкст выяўляецца праз паказ антыфашысцкага супраціву і паўсядзённага жыцця падпольшчыкаў. Праведзеная камандзірам дыверсійнай групы Манзуравым ваенная аперацыя пад Клецкам пафасна засяроджвае ўвагу на кожным канкрэтным эпізодзе барацьбы з акупантамі. Апагеем завастрэння трагічнай сітуацыі становіцца натуралізм паказу здзекаў нямецкай жандармерыі з членаў падполля і іх расстрэл у нясвіжскім астрозе: Пакуты ад голаду, ад дзікіх пабояў, ад нечалавечага здзеку не пакідалі іх з дня ў дзень, ішлі за імі крывавым прывідам [7, с. 72]. У процівагу аптымістычнаму малюнку аб’яднання Беларусі ў 1939 г. традыцыйны ўспамін пісьменніка пра буржуазную Польшчу. Выкрыццё аўтара энергічнае пры паказе выпадкаў здрадніцтва адмоўных персанажаў Савецкай уладзе і іх служэння фашыстам. Г. Далідовіч адзначаў: «Як пісьменнік Дамашэвіч вельмі традыцыйны, але ў гэтай традыцыйнасці заўсёды свежы, нечаканы» [4, с. 111].

Асновай праяўлення ваеннай тэматыкі ў творчасці У. Ліпскага сталі дзіцячыя ўспаміны пра ваенныя гады, праведзеныя з маці ў нястачы і выпрабаваннях. Дакументальная проза стала падмуркам прафесійнай журналісцкай і літаратурнай дзейнасці пісьменніка. Мастацкая спадчына 1980-х гг. прадстаўлена жанрам ваеннай аповесці: «Крутыя вёрсты» (1985) і «Пралескі ў небе» (1985). Твор «Крутыя вёрсты» ў свой час з’яўляўся вельмі актуальным і неаднаразова перавыдаваўся

на прасторах былога СССР. Аповесць распавядае пра Героя Савецкага Саюза, палачанку З.М. Тусналобаву-Марчанка, якая ў гады вайны была медыцынскай сястрой, вынесла з поля бою сто дваццаць тры байцы, страціла пасля ранення рукі і ногі, але ў паваеннай сітуацыі не скарылася абставінам – мела сям'ю, дзяцей і прымала актыўны ўдзел у паўсядзенным жыцці. Сюжэтна-кампазіцыйная структура «Крутых вёрстаў» уключае форму анкеты, выразна ідэалагізаваныя фактаграфічныя зводкі з заводаў і фабрык, а таксама лозунгавую форму аповеду ў пэўных эпізодах. Такім чынам, для літаратурнага працэсу першай паловы 1980-х гг. аповесць стала прыкладам твора з савецкай ідэйна зададзенай этычнай праблематыкай. Аздабленне тэксту аповесці пейзажнымі замалёўкамі, гумарыстычнымі момантамі падкрэслівала і ўзмацняла трагічную ваенную рэальнасць.

Эпізод эвакуацыі дзіцячага дома ў Полацку і гібель баявога лётчыка А. Мамкіна падчас здзяйснення аперацыі сталі дакументальнай асновай аповесці «Пралескі ў небе». Па словах Ю. Гусева, «творы У. Ліпскага адрозніваюцца ўменнем паказаць лёс чалавека ў сумежнасці з абставінамі, акаляючым асяроддзем» [3, с. 191]. Выкарыстанне мастацкіх сродкаў пры абмалёўцы псіхалагічнага стану А. Мамкіна стала асновай для падкрэслівання нацыянальнага каларыту, выявілася праз прыём рэтраспекцыі і ліставання лётчыка са сваёй каханай Клавай: Буду збіраць табе ў падарунак букеты промняў, гаючыя пахі кветак, спевы лясных музыкаў [8, с. 99].

Дамінантным у творы стаў вобраз дзяцей вайны. Сюжэт аповесці таксама па-мастацку ўзмоцнены з'яўленнем у яго падзейнай канве вобраза З.М. Тусналобавай-Марчанка. Дакументалізм «Пралесак у небе» асабліва востра праяўляецца ў выкарыстанні пісьменнікам зводак інфармбюро з паведамленнямі пра дзіцячыя лагеры донараў, а метафарызм назвы твора звязаны з тэмам дзяцей-ахвяр: Мамкін узіраўся ў твары дзяцей, у яго было адзінае жаданне: вывезці пралесак на волю [8, с. 94].

Такім чынам, У. Дамашэвіч і У. Ліпскі на нацыянальным матэрыяле звярнуліся да вопыту мінулай вайны, адлюстравалі адназначна станоўчых ці адмоўных персанажаў у тыповых абставінах. Назва твора У. Дамашэвіча «Кожны чацвёрты» адводзіць чытача да гістарычнага беларускага кантэксту перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Аповесць «Першым заўсёды цяжка» ўздымае тэму дзейнасці камсамольскага падполля, якая ў савецкі час патрабавала праверкі на сапраўднасць фактаў. У выяўленчым плане пісьменнік у творы працягвае традыцыі сацылістычнага рэалізму, паказвае подзвіг беларускіх дзеячаў Клецкага падполля з выкарыстаннем фактаграфічнай асновы. Праўда факту прывяла пісьменніка да адлюстравання драматычных сітуацый, што ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны спарадзілі велізарную колькасць нявінных ахвяр на тэрыторыі Беларусі. Аповесці У. Ліпскага «Крутыя вёрсты» і «Пралескі ў небе» таксама створаны на нацыянальнай фактаграфічнай аснове з выкарыстаннем прататыпаў галоўных персанажаў – Героя Савецкага Саюза, медсястры З. Тусналобавай-Марчанка, баявога лётчыка А. Мамкіна

пры правядзенні аперацыі па эвакуацыі Полацкага дзіцячага дома. Дадзены факт падкрэслівае выхаваўчую мастацкую пазіцыю пісьменніка пры адлюстраванні самаахвярнасці беларуса ва ўмовах экстрэмальнай ваеннай сітуацыі.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Андраюк, С. Беларус / С. Андраюк // Крыніца. – 1998. – № 8. – С. 2–25.
2. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддя : у 4 т. / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітарн. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: У.В. Гніламёдаў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 1999–2015. – Т. 4, кн. 1 : 1966–1985. – 2004. – 928 с.
3. Гусев, Ю. Возвышение человека. Заметки о литературном творчестве Владимира Липского / Ю. Гусев // Нёман. – № 4. – 2005. – С. 187 – 195.
4. Далідовіч, Г. Адзін з самых… / Г. Далідовіч // Маладосць. – № 2. – 1998. – С. 90–118.
5. Далідовіч, Г. Закон Дамашэвіча: згадка пра старэйшага сябра / Г. Далідовіч // Дзеяслоў. – № 1 (80). – 2016. – С. 241–251.
6. Дамашэвіч, У. Кожны чацвёрты : аповесць / У. Дамашэвіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1991. – 284 с.
7. Дамашэвіч, У. Першым заўсёды цяжка : дакум. аповесць : для сярэдн. і ст. шк. узросту / У. Дамашэвіч, У. Сазановіч. – Мінск : Юнацтва, 1986. – 96 с.
8. Ліпскі, У. Пралескі ў небе. Аповесці, апавяданні, казкі : для мал. і сярэд. шк. узросту / У. Ліпскі. – Мінск : Юнацтва, 1997. – 366 с.
9. Тычына, М. Змена квадры : літаратурна-крытычныя артыкулы / М. Тычына. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1983. – 202 с.